З НАДЫХОДЗЯЧЫМ ПЕРШАМАЙСКІМ СВЯТАМ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 8 (1001) | ЧАЦВЕР, 26 красавіка 2001 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## БЕЛАРУСЬ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ РАЗВІЦЦЯ

**ПРА ЯЕ ЗНЕШНІЯ ПРАБЛЕМЫ РАСКАЗАЎ НА СУСТРЭЧЫ Ў НАШЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ПЕРШЫ НАМЕСНІК МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ КРАІНЫ В.У.ВЯЛІЧКА.**

***Падчас знаходжання ў Гомелі шостага красавіка першы намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь В.У.Вялічка наведаў наш універсітэт. У актавай зале яго цёпла віталі выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся.***

Уступным словам сустрэчу адкрыў і вёў рэктар універсітэта член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу краіны прафесар М.В.Селькін. Міхаіл Васільевіч пазнаёміў прысутных з высокім госцем, імя якога добра вядома многім гамяльчанам і жыхарам прысожскага рэгіёна. Як кандыдат эканамічных навук В.У.Вялічка некаторы час працаваў па сумяшчальніцтву і ў нашым універсітэце. Адзін з цяперашніх кіраўнікоў знешнепалітычнага ведамства Беларусі працягвае падтрымліваць карысныя сувязі з ГДУ. Менавіта дзякуючы намаганням Валянціна Уладзіміравіча ў самы кароткі тэрмін у наш універсітэт быў дастаўлены з Германіі вельмі каштоўны падарунак — унікальная асабістая бібліятэка сусветна вядомага нямецкага матэматыка Вольфганга Гашуца.

Перад шматлікай аўдыторыяй В.У.Вялічка апавядаў аб сённяшнім становішчы Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне, акрэсліў асноўную стратэгію знешнепалітычнага курсу нашай суверэннай дзяржавы. Прамоўца падкрэсліў, што Беларусь праводзіць шматвектарную палітыку, вызначаную кіраўніцтвам дзяржавы ў адносінах не толькі да сваіх бліжэйшых суседзяў, але і больш далёкіх партнёраў. Цяпер наша краіна мае дыпламатычныя місіі ў 42 дзяржавах планеты.

Найбольшую ўвагу ў сваім выступленні В.У.Вялічка ўдзяліў пашырэнню супрацоўніцтва Беларусі з бліжэйшым яе суседам — Расіяй. Ён адзначыў, што ўжо споўнілася 5 гадоў з часу падпісання Дагавора аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі. Гэта тэма цяпер надзвычай актуальная. Яна актыўна абмяркоўваецца ў грамадстве. Людзей цікавяць перспектывы развіцця саюзных узаемаадносін. Іх хвалюе, ці не страціць Беларусь у выніку аб'яднання свой суверэнітэт, ці не стане яна заходняй губерніяй Расіі, адной з яе рэгіянальных акруг? На гэтыя пытанні даюць адказы відавочныя ўсім нам рэаліі ўтворанага Саюза.

В.У.Вялічка зазначыў, што Расія была і застаецца асноўным эканамічным і стратэгічным партнёрам Беларусі. 65% — доля Расійскай Федэрацыі ў агульным аб'ёме знешнеэканамічнай дзейнасці нашай рэспублікі. Тавараабарот нашых краін дасягнуў 9,3 млрд. долараў і працягвае прыкметна ўзрастаць.

Саюз Беларусі і Расіі адкрыў шырокія перспектывы для ўзаемадзеяння і дасягнення высокіх паказчыкаў у важнейшых жыццёвых накірунках.

Аналізуючы сучаснае эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі, В.У.Вялічка гаварыў таксама аб яе адносінах з Украінай, рэспублікамі Прыбалтыкі і некаторымі краінамі, якія ўваходзяць у склад СНД.

Напрыканцы сустрэчы з намеснікам кіраўніка знешнепалітычнага ведамства краіны прысутных цікавіла, ці будуць закладзены ў бюджэт саюзнай дзяржавы на сёлетні год сродкі на стварэнне сумеснага Беларуска-Расійскага універсітэта, які мяркуецца адкрыць у Магілёве? Чаму ў рэспубліцы і за яе межамі за апошні час аслабла ўвага да многіх вострых праблем, звязаных з ліквідацыяй вынікаў чарнобыльскай катастрофы? І, канешне, не магло не прагучаць пытанне аб магчымасцях росту студэнцкай стыпендыі.

На ўсе зададзеныя пытанні іх аўтары атрымалі вычарпальныя адказы.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

*Рэктару Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, члену Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М.В.Селькіну; рэдактару газеты "Гомельскі універсітэт" У.П.Балогу.*

**Паважаныя Міхаіл Васільевіч, Уладзімір Паўлавіч!**

Дазвольце сардэчна вітаць Вас з выхадам 1000-га нумара газеты "Гомельскі універсітэт". Шлях, які прайшла газета, неаддзельны ад лёсу вашага універсітэта — адной з вядучых ВНУ краіны. У суладдзі дум і спраў плённа жыць і працаваць Вам і ў новым стагоддзі!

Прыміце шчырыя пажаданні дабра, далейшых творчых здзяйсненняў і асабістага шчасця!

З павагай:
галоўны рэдактар газеты "Чырвоная змена",
член Саюза беларускіх пісьменнікаў
**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ;**
намеснік галоўнага рэдактара газеты "Мінская праўда"
**Алег ШВЕДАЎ.**

## У ГОНАР ЮБІЛЕЮ

10 красавіка г.г. чытачы азнаёміліся з матэрыяламі юбілейнага, 1000-га нумара шматтыражнай газеты "Гомельскі універсітэт". Да гэтай падзеі за шматгадовую плённую працу яе рэдактар Уладзімір Балога і спецыяліст І катэгорыі Тамара Дубяк узнагароджаны Граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

За шматгадовы актыўны і плённы ўдзел у падрыхтоўцы газеты "Гомельскі універсітэт" і ў сувязі з выхадам яе юбілейнага нумара дацэнт кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі Таццяна Аўдоніна і старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту, пазаштатны спартыўны аглядальнік газеты Віктар Марчанка ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі ГДУ.

За аператыўнае паліграфічнае забеспячэнне газеты вядучыя інжынеры-матэматыкі ІВЦ Валянціна Абраменка і Таццяна Кадол прэміраваны.

Студэнтцы 4-га курса юрыдычнага факультэта, прэс-сакратару юрфака Анастасіі Лук'янавай і студэнтцы 3-га курса філалагічнага факультэта Таццяне Целяховіч аб'яўлены падзякі. Як найбольш актыўныя студкоры яны таксама заахвочаны матэрыяльна.

10-га красавіка адбылася ўрачыстасць, прысвечаная юбілейнаму нумару газеты. Калектыў яе рэдакцыі і ўсіх прысутных ад імя рэктарата цёпла павіншаваў, уручыў Ганаровыя граматы і прэміі ўзнагароджаным прарэктар па навуковай рабоце Д.Р.Лін. Шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні прагучалі таксама ў выступленнях старшыні прафкома Г.І.Варатніцкага, вучонага сакратара універсітэта В.Ю.Залатарэнкі, гасцей — галоўнага рэдактара газеты "Чырвоная змена", члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Алеся Карлюкевіча, выпускнікоў нашага універсітэта намесніка галоўнага рэдактара газеты "Мінская праўда", члена Беларускага саюза журналістаў Алега Шведава, галоўнага рэдактара газеты "Гомельские ведомости" Мікалая Дзямчыхіна.

<u>Размеркаванне маладых спецыялістаў</u>

## ЖЫЦЦЁ СТВАРАЦЬ САМІМ

2001-ы год для пяцікурснікаў універсітэта — асабліва сімвалічны. Яны першымі сярод студэнцкай моладзі ГДУ пачнуць сваю самастойную працоўную дзейнасць у новых XXI стагоддзі і тысячагоддзі. Якім будзе жыццё людзей у наступіўшых эпахальных летавылічэннях, безумоўна, залежыць у многім ад здольнасцей, таленту моладзі, якая атрымала вышэйшую адукацыю па самых розных галінах ведаў. Менавіта ёй ствараць будучыню, рабіць усё, каб яна станавілася лепшай ва ўсіх адносінах. Гэта пачне рэальна ажыццяўляцца літаральна праз некалькі месяцаў, калі выпускнікі стануць уладальнікамі дыпломаў аб вышэйшай адукацыі, а пакуль у сярэдзіне красавіка яны атрымлівалі накіраванні на працу.

759 юнакоў і дзяўчат (з улікам кантрактнай формы навучання) падрыхтавана сёлета ў нашым універсітэце. Згодна заканадаўству ўсе яны маюць права на атрыманне працоўнага месца. Па заяўках Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь выпускнікі з дыпломамі педагогаў прыйдуць у школьныя класы нашага абласнога цэнтра, гарадоў і вёсак Гомельшчыны, на жаль, і тых, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Педагагічны атрад складае 502 чалавекі.

Больш складаныя справы з маладымі кадрамі вытворчых спецыяльнасцей. Эканамічны крызіс на постсавецкай прасторы прывёў да заняпаду ў прамысловасці, іншых сферах жыцця, скарачэння рабочых месцаў і росту беспрацоўя. Таму некаторым новаспечаным спецыялістам з эканамічнага і фізічнага (вытворчага аддзялення) факультэтаў давялося самастойна пашукаць сабе месца працы ў розных камерцыйных, дзяржаўных і прыватных фірмах, структурах, акцыянерных таварыствах і г.д.

Запатрабаванымі з'яўляюцца на сённяшні дзень выпускнікі спецыяльнасцей "Геалогія і разведка карысных выкапняў", "Гідрагеалогія", якіх забіраюць ВА "Белгеалогія", "Беларусьнафта", Беларускі навукова-даследчы геолагаразведачны інстытут і інш.

Сёлета самы вялікі атрад (з улікам кантрактнага навучання) па колькасці маладых спецыялістаў выпускае юрыдычны факультэт — 89 правазнаўцаў. Папоўняцца гэтымі кадрамі праваахоўныя, следчыя органы, натарыяльныя канторы, падатковыя службы горада і вобласці.

Універсітэт забяспечвае маладымі кадрамі і сябе. Сёлета на яго кафедры прыйдуць выпускнікі-выдатнікі спецыяльнасцей "Англійская мова" (4), "Нямецкая мова" (2), "Гісторыя" (2), "Правазнаўства" (2), "Біялогія (1), "Фізічнае выхаванне" (2), "Матэматыка" (1), "Мікраэлектроніка" (1). Калектывы інфармацыйна-вылічальнага цэнтра і навукова-даследчага сектара ГДУ папоўняцца 4 выпускнікамі спецыяльнасці "Прыкладная матэматыка".

У ВНУ горада — тэхнічны універсітэт імя П.О.Сухога, кааператыўны і медыцынскі інстытуты накіраваны адпаведна 4 выпускнікі спецыяльнасцей "Прыкладная матэматыка", правазнаўства, "Матэматыка", АСАІ.

За студэнцкія гады многія юнакі і дзяўчаты паспелі стварыць сем'і, некаторыя ўжо маюць дзяцей, што давала ім права на самастойнае працаўладкаванне. Яго атрымалі таксама некаторыя іншыя студэнты згодна дзеючага заканадаўства.

Цяпер, калі перад дзяржаўнай размеркавальнай камісіяй пяцікурснікі замацавалі сваім подпісам згоду на атрыманне працоўнага месца, яны з лёгкім сумам адчулі, што студэнцкія гады, на жаль, заканчваюцца.

**Т.ДУБЯК.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За высокія дасягненні ў навуковых даследаваннях і вучэбна-навуковай рабоце загадчык кафедры беларускай літаратуры прафесар ШТЭЙНЕР Іван Фёдаравіч узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

*За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаны дацэнт кафедры матэматычнага аналізу ГАЎРЫЛЮК Аляксандр Уладзіміравіч.*

*За высокія дасягненні ў навуковых даследаваннях і вучэбна-навуковай рабоце Граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаны: КУРЫЛКІНА Святлана Мікалаеўна — прафесар кафедры оптыкі; МЯДЗВЕДЗЕЎ Валерый Анатольевіч — дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту; СЕМЯНЧУК Уладзімір Мікалаевіч — загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі; РУЖЫЦКАЯ Алена Адольфаўна — дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання; ТРАЦЭЎСКАЯ Алена Юр'еўна — загадчык кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў.*

*За плённую навукова-педагагічную і вучэбна-трэніровачную дзейнасць Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаны дацэнт кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту МІХАЛЕНЯ Валерый Маркавіч.*

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта горача віншуюць названых вучоных ГДУ з узнагародамі і жадаюць ім далейшых поспехаў у вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці.*

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры вышэйшай матэматыкі дацэнта **СЕМЕНЧУКА Уладзіміра Мікалаевіча** з выпадку прысуджэння яму Калегіяй БелВАКа вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.*

*Пісьменнікі і журналісты – студэнтам*

# І МУЖНАЯ, І ШЧЫРАЯ ДУША...



***Па ініцыятыве дэканата філалагічнага факультэта і пры падтрымцы абласнога аддзялення СП у нашым універсітэце адбылася сустрэча з таленавітым майстрам беларускага мастацкага слова, в.а. старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Вольгай Іпатавай.***

Дзякуючы той атмасферы шчырасці, нязмушанасці, павагі і зацікаўленасці, якая панавала ў актавай зале падчас сустрэчы, усе прысутныя на ёй здолелі ацаніць не толькі арыгінальнасць прачытаных аўтаркай вершаў ці па-новаму асэнсаваць добра вядомыя гістарычныя творы пісьменніцы, але і адчуць сапраўдны маштаб асобы Вольгі Іпатавай. А лёс не быў да яе літасцівым: у чатырохгадовым узросце яна трапіла ў дзіцячы дом. Праз некалькі год першымі слухачамі, чытачамі і крытыкамі яшчэ вучнёўскіх вершаў Вольгі і сталі такія ж, як яна дзятдомаўцы.

На пытанне да Вольгі Іпатавай, як яна прыйшла да "сваёй", гістарычнай тэмы ў літаратуры, пісьменніца адказала па-філасофску мудра і разам з тым вельмі проста: "Без гісторыі, без мінулага няма ў чалавека і будучыні." Дарэчы, вялікая колькасць пытанняў, якія прагучалі на сустрэчы, паказала, што студэнты чакалі і атрымалі адказы ад Вольгі Іпатавай на аўтарытэтным узроўні па самых разнастайных праблемах грамадска-культурнага жыцця.

"Усе творы пішуцца імгненна, ледзь рука паспявае за думкамі, але бывае так пакутую, не магу патрэбнага слова падабраць, а кінуць не магу — маё ж!" — сказала пісьменніца. Але, думаецца, словы "маё ж" выявілі не толькі мастакоўскае крэда Вольгі Іпатавай, але і яе жыццёвую пазіцыю, бо творцы баліць за ўсё і ўсіх, яе сэрца, кажучы словамі У. Караткевіча, "распята за ўсе мільярды двухногіх".

Паўтары гадзіны дыялогу пісьменніцы і аўдыторыі сталі сапраўдным святам духоўнасці роднага беларускага слова, гонару за родную зямлю, якая спрадвеку нараджае прыгожых і моцных людзей.

**Вераніка ЖАРАНКОВА,**
**студэнтка гр. БА-13**
**філалагічнага факультэта.**

# ПРАЦЯГ ДОБРАЙ ТРАДЫЦЫІ

Нядаўна на філалагічным факультэце адбылася сустрэча галоўнага рэдактара "Чырвонай змены" Алеся Карлюкевіча і намесніка рэдактара "Мінскай праўды" Алега Шведава са студэнтамі, у тым ліку з будучымі журналістамі.

Адразу хочацца адзначыць, што ва аўдыторыі панавала атмасфера добразычлівасці і ўзаемнай зацікаўленасці.

Алесь Мікалаевіч не толькі расказаў шмат цікавага пра журналісцкую працу, нават паскардзіўся на цяжкасці, якія перажывае зараз "Чырвоная змена", але і запрасіў да супрацоўніцтва, чым прыемна здзівіў і адначасова парадаваў студэнтаў.

Вельмі карыснымі былі і практычныя парады. Мяне ўразілі словы аб тым, што пачынаючы журналіст не павінен імкнуцца да зор і высокіх ганарараў. Трэба перш за ўсё плённа працаваць. Будуць поспехі, будуць і цяжкасці. Усё прыйдзе з вопытам. Не трэба баяцца працы!

Згадзіўся з такімі думкамі і Алег Шведаў, выпускнік філалагічнага факультэта ГДУ. Ён пажадаў будучым калегам творчых поспехаў, знайсці сваё месца ў жыцці і, канешне, вялікага чалавечага кахання.

Прыемна дадаць, што прысутнічаў на сустрэчы і Уладзімір Балога, рэдактар "Гомельскага універсітэта". Менавіта 10 красавіка ўбачыў свет юбілейны, 1000-ы нумар газеты.

Уражанне засталося незабыўнае! Паболей бы такіх сустрэч.

**Аксана ВАЛОШЫНА,**
**студэнтка гр. БЖ-12.**

**Канферэнцыі**

# ПА АКТУАЛЬНЫХ ПЫТАННЯХ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ



Сучасныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, рэформа агульнаадукацыйнай школы патрабуюць новых метадаў кіравання сістэмай адукацыі, больш высокага ўзроўню падрыхтоўкі кадраў у галіне эканомікі, кіравання, адукацыі і культуры. Вырашыць гэтыя задачы заклікана вышэйшая школа праз развіццё і ўдасканаленне розных форм навучання, у тым ліку і завочнай. Спецыялісты, якія працуюць на прадпрыемствах, ва ўстановах, у школах і набываюць тэарэтычныя веды без адрыву ад работы, павінны быць падрыхтаванымі да практычнай дзейнасці ў новых умовах сацыяльна-эканамічнага і грамадскага жыцця.

Актуальным пытанням навукова-метадычнай работы, арганізацыі завочнага навучання, яго вопыту, зместу і метадыцы прысвячалася навукова-метадычная канферэнцыя, якая на працягу двух дзён працавала ў нашым універсітэце. Перад яе пачаткам у фае корпуса № 5 была наладжана выстаўка вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры, а таксама падведзены вынікі агляду-конкурсу навукова-метадычных выданняў выкладчыкаў універсітэта.

Уступным словам канферэнцыю адкрыў першы прарэктар ГДУ А.П.Кармазін. На пленарным пасяджэнні з дакладамі выступілі: дэкан завочнага факультэта М.Н.Мурашка — "Завочнае навучанне ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце і задачы павышэння яго эфектыўнасці", загадчык кафедры беларускай мовы А.А.Станкевіч — "Роля кафедры ў метадычным забеспячэнні вучэбнага працэсу на завочным факультэце", загадчык кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК С.М.Гавейка — "Дыстанцыйнае навучанне і ўдасканальванне падрыхтоўкі спецыялістаў у сістэме завочнай адукацыі".

На другі дзень работа канферэнцыі працягвалася ў 5 секцыях. Заслухана і абмеркавана звыш 100 навуковых дакладаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія асвятлялі разнастайныя аспекты далейшага ўдасканалення завочнага навучання.

*5-гадовы юбілей GCSW*

# КАМП'ЮТЭРНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ – ШКОЛЬНІКАМ І СТУДЭНТАМ



***На базе ІВЦ і матэматычнага факультэта універсітэта адбыўся юбілейны 5-ы штогадовы Гомельскі Тыдзень Камп'ютэрных Навук (Gomel Computer Science Week — GCSW 2001).***

Па традыцыі яго асноўная мэта — стварэнне сродкаў і накапленне вопыту выкарыстання сучасных камп'ютэрных сеткавых тэхналогій у вучэбнай і навукова-даследчай рабоце школьнікаў і студэнтаў.

У праграму тыдня ўваходзілі шахматны турнір; матэматычныя баі; праграміраванне, камандныя туры па праграміраванню сярод пачынаючых і прафесіяналаў; конкурс па праектаванню лічбавага абсталявання і інш.

Ва ўсіх гэтых мерапрыемствах для аўтаматычнага забеспячэння рэгістрацыі, атрымання заданняў, адпраўлення рашэнняў, атрымання табліц вынікаў удзельнікі маглі на свой густ (і ў адпаведнасці са сваімі тэхнічнымі магчымасцямі) карыстацца як INTERNET-online (пры дапамозе нашага сайта), так і электроннай поштай.

У алімпіядах і конкурсах, якія адбыліся ў рамках GCSW 2001, прынялі ўдзел больш за 100 школьнікаў і студэнтаў, з якіх каля 40 — негамяльчане, якія выкарыстоўвалі сродкі электроннай камунікацыі.

Асаблівую цікавасць, безумоўна, выклікала алімпіяда па праграміраванню сярод прафесіяналаў. У ёй удзельнічала 86 школьнікаў і студэнтаў з чатырох краін — Беларусі, Расіі, Украіны і Латвіі і гарадоў: Гомель, Мінск, Віцебск, Магілёў, Рыга, Курган, Усолье-Сібірскае, Новачэркаск, Запарожжа.

Любы студэнт і школьнік мог прыняць удзел ва ўсіх спаборніцтвах GCSW 2001, нягледзячы на тое, што яны былі закрытымі. Справа ў тым, што ўмовы заданняў усіх конкурсаў пераносіліся ў спецыяльныя трэніровачныя курсы, якія (як і заданні GCSW 99 і GCSW 2001) кругласутачна даступныя зарэгістраваным карыстальнікам.

Трэба адзначыць, што і сайт, і робат могуць працаваць на адной з выбраных карыстальнікам моў: рускай ці англійскай. Як вынік, мы ўжо маем зарэгістраваных у нашым праекце карыстальнікаў больш чым з 20 краін свету.

На жаль, не абышлося і без накладак, перш за ўсё выклікаeveryных якасцю сувязі як унутры Гомеля, так і ў сетцы UNIBEL/Belpak. GCSW 2001 паказаў, што эфектыўна сучасныя камп'ютэрныя сеткавыя тэхналогіі (асабліва INTERNET-тэхналогіі) не могуць быць выкарыстаны без наяўнасці хуткіх тэлекамунікацыйных каналаў. Відавочна таксама, што пры ўзрастанні нагрузак вузкім месцам можа стаць і недастаткова моцны WWW-сервер ГДУ. Тым не менш, ужо зараз наш праект "Дыстанцыйнае навучанне" можа быць паспяхова выкарыстаны ў глабальнай сетцы пры дапамозе электроннай пошты, а таксама ў лакальнай сетцы універсітэта пры дапамозе Intranet.

У бліжэйшай перспектыве мы збіраемся выкласці ў якасці трэніровачных курсаў усе назапашаныя задачы школьных і студэнцкіх алімпіяд па праграміраванню; пачаць развіццё навучаюча-трэніровачна-кантралюючага курса "Падрыхтоўка да рашэння алімпіядных задач па праграміраванню"; перапрацаваць назапашаныя алімпіядныя задачы па праграміраванню ў задачы па інфарматычнай матэматыцы (умовы тыя ж, але патрабуецца не напісаць праграму, а пралічыць рукамі адказы для нейкага мноства тэкстаў); запусціць вучэбны курс "Прафесійнае праграміраванне на C"; укараніць магчымасці праекта "Дыстанцыйнае навучанне" для кантролю паспяховасці школьнікаў пры падрыхтоўцы да алімпіяд па праграміраванню і студэнтаў пры выкананні імі лабараторных работ па курсах: "ЭВМ і праграміраванне", "Фізічныя асновы ЭВМ", для праверкі правільнасці распрацаваных імі праграм на мовах праграміравання Паскаль, C і асэмблера для розных мікракантралёраў і інш.; забяспечыць "бясшоўную інтэграцыю" нашага праекта з некаторымі іншымі праектамі, якія маюць аднолькавыя мэты, напрыклад, даць магчымасць нашым зарэгістраваным карыстальнікам удзельнічаць у алімпіядах USACO (www.usaco.org) і ў тэсціраванні сваіх рашэнняў задач з іспанскага тэсціруючага сервера; укараніць распрацаваную тэхналогію арганізацый электронных канферэнцый пры дапамозе сайта для абмеркавання пытанняў, якія прадстаўляюць агульны інтарэс для нашых карыстальнікаў, напрыклад, спосабы рашэння той ці іншай задачы; увесці ў практыку функцыяніравання распрацаваную сістэму загрузкі на сайт ГДУ і чытання навукова-даследчых матэрыялаў, якія прадстаўляюць цікавасць для грамадскасці.

Здзяйсненне гэтых планаў, а таксама больш шырокае ўкараненне распрацовак у практыку вучэбнай і навукова-даследчай работы нашага універсітэта, перавод прафарыентацыйнай дзейнасці універсітэта на рэйкі сучасных інфармацыйных тэхналогій могуць быць значна паскораны з правядзеннем наступных мерапрыемстваў:

— выдзяленнем інфармацыйна-вылічальнаму цэнтру 8-мі дадатковых кругласутачных тэлефонных ліній у корпусе 5 для забеспячэння аддаленага доступу да рэсурсаў універсітэцкай сеткі школам, ВНУ (у тым ліку БелДУТу і ГДТУ імя Сухога), супрацоўнікам і студэнтам ГДУ; сродкаў на набыццё сучаснага сервера пад WWW-сайт ГДУ. Трэба адзначыць, што ўкараненне такога сервера дазволіць таксама прыкметна паскорыць работу падсістэм АСУ і карпаратыўнай вылічальнай сеткі універсітэта ў цэлым.

Заахвочаны аспіранты і студэнты матэматычнага факультэта, якія прынялі актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні GCSW 2001:

— за эксплуатацыю і развіццё сістэмы аўтаматызацыі дыстанцыйнага навучання, удзел у падрыхтоўцы і правядзенні ўсіх конкурсаў і алімпіяд: А.Бяглюк, М.Аксюцік, В.Капічэнка — студэнты 1-га курса; К.Судзілоўскі — студэнт 2-га курса; А.Кузняцоў, Д.Дзегцяроў — студэнты 4-га курса;

— за падрыхтоўку і правядзенне конкурсаў па праектаванню лічбавага абсталявання і сумеснаму праектаванню праграмнага і апаратнага забеспячэння ўбудаваных лічбавых сістэм: А.Федарцоў, В.Літвінаў — аспіранты кафедры матэматычных праблем кіравання, А.Карнейчук, В.Налягач, І.Коршунаў — студэнты 5-га курса;

— за падрыхтоўку і правядзенне конкурсу па праграміраванню мікракантралёраў AVR, MCS51, 68HCO5/08, Intel 8086: І.Ермалаеў — аспірант кафедры матэматычных праблем кіравання, І.Ганчарэнка, А.Талкачоў — студэнты 5-га курса.

— за падрыхтоўку і правядзенне турніра па рашэнню шахматных задач: Д.Аужын — студэнт 3-га курса.

— за распрацоўку сайта GCSW 2001: А.Цой — студэнт 2-га курса.

Ужо распачата падрыхтоўка да GCSW 2002. Калі вы жадаеце дапамагчы ў яе правядзенні або атрымаць вопыт практычнай работы ў маштабных праектах у сферы новых інфармацыйных тэхналогій, пішыце на адрас dolinsky@gsu.unibel.by.

**М. ДАЛІНСКІ, к.т.н.,**
**начальнік ІВЦ.**

# МОЛАДЗІ – АЛІМПІЙСКІЯ ВЕДЫ



**У Мінску прайшоў справаздачна-выбарны Алімпійскі сход Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь.**

**Расказаць аб гэтай падзеі я папрасіў члена Нацыянальнага алімпійскага камітэта ад Гомельшчыны загадчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту нашага універсітэта, заслужанага трэнера Беларусі, дацэнта Віктара Антонавіча Каляду.**

— Справаздачна-выбарны сход, які праходзіў з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі і членаў урада, пакінуў глыбокае ўражанне на ўсіх прысутных.

Прыемна адзначыць, што Прэзідэнтам НАК нашай краіны на другі тэрмін выбраны кіраўнік А.Р.Лукашэнка.

Акрамя гэтага, справаздачна-выбарны Алімпійскі сход НАК прыняў пастанову, у якой ёсць адзін пункт, які я хачу працытаваць: "Сумесна з Беларускай акадэміяй фізічнай культуры і спорту распрацаваць і ажыццявіць комплекс мерапрыемстваў па развіццю алімпійскай адукацыі ў рэспубліцы, выдаць Алімпійскі падручнік. Прапанаваць Міністэрству адукацыі ўвесці з новага навучальнага года ва ўсіх школах Беларусі алімпійскія ўрокі. Распрацаваць і ўкараніць у практыку праграму распаўсюджвання алімпійскіх ведаў сярод студэнцкай моладзі..."

У гэтай сувязі мы на кафедры пачалі ўжо займацца распрацоўкай цыкла лекцый па алімпійскай тэматыцы, каб з 1 верасня г.г. распачаць выкананне гэтага пункта пастановы.

Да сказанага мне застаецца дадаць, што членамі Нацыянальнага алімпійскага камітэта ад Гомельшчыны выбраны: намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама У.У.Давідовіч і старшыня ўпраўлення па фізічнай культуры, спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама В.В.Жаранкоў.

Упершыню былі выбраны Ганаровыя члены Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Прыемна адзначыць, што сярод іх і наш зямляк В.П.Пуцькоў.

Упэўнены, што выбраны састаў Нацыянальнага алімпійскага камітэта зробіць усё магчымае, каб беларускія спартсмены з годнасцю прадставілі нашу краіну на XIX зімовых і XXVIII летніх Алімпійскіх гульнях.

**Запісаў В.МАРЧАНКА.**

# ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

Творчасць студэнтаў-філолагаў

Кацярына КАРАТЫШ,
студэнтка гр. Б-22.

## РАДЗІМЕ

*Я бывала не раз на чужой старане,*
*Але ж там таго шчасця няма:*
*Нешта ў сэрцы шчыміць, нешта цягне мяне —*
*Цудадзейная сіла сама.*
*Гэта ж ты мяне клічаш, Радзіма мая,*
*Я ў растанні пражыць не змагла.*
*Мілагучнаю хваляю песня твая*
*Праз гады скрозь за мною плыла.*
*Беларусь, ты таксама і маці мая.*
*Ты выходзь, ты дачку сустракай.*
*Мяне вабіць і зноў тут прырода твая,*
*Сэрцу любы азёрны край.*
*Беларусь, я ніколі не здраджу табе,*
*Я прысягу на вернасць даю:*
*Буду ў горычы, ў шчасці і у журбе*
*Абаронцай за годнасць тваю.*

***

*Шэры цемень запоўз у душу,*
*Прытаіўся на сэрцы змрок.*
*Што чакаць ад жыцця цяпер?*
*Які будзе наступны крок?*
*Як прайсці праз агонь да людзей?*
*Як прабіцца травінкай скрозь снег,*
*Каб не страціць тых кволых надзей,*
*Не пачуць за спіною смех?*
*Ты руку мне падай з вышыні,*
*Адгані прэч маркотны настрой.*
*Я застацца хачу ў цішыні,*
*Каб пабыць на імгненне з табой.*

Марина СЕВЕРЬЯНОВА,
студентка гр. БЖ-12.

## ДОРОГА К ЗВЕЗДАМ

*Взгляни на небо — сколько*
*звезд!*

*Я их тебе дарю.*
*Они — охапки белых роз,*
*Вплетенные в зарю.*

*Молчат уста, кричит душа —*
*Я чувств не утаю.*
*Суд над бездействием верша,*
*Люблю тебя, люблю.*

*Окинь глазами ночи дно*
*И обними луну.*
*В душе — желание одно:*
*Дарить реальность сну.*

*И я дарю, я растворюсь*
*В прозрачном море грез.*
*И, может быть, я научусь*
*Летать до самых звезд.*

Наталля ЦУЛЫГІНА,
студэнтка гр.Б-42.



* * *

*Вясна прыйшла!*
*Звaніце у званы!*
*Вясна прыйшла!*
*Няма ўжо зімы!*
*Каля калодзежа звініць ручэй,*
*А сонца зззяе — не падняць вачэй.*
*І так прыгожа стала на двары...*
*Вясна прыйшла!*
*Званіце у званы!*
*У паветры подых першых*
*навальніц,*
*Духмяных траў і кветак, і суніц.*
*Так хораша, так добра на душы...*

*Вясна прыйшла!*
*Званіце у званы!*

Елена КАЦУРА,
студентка гр. РБ-43.

## ПРОЩЕНИЕ

*Я прощаю вас всех –*
*Мои мысли чисты.*
*Пусть удача, успех*
*Дарят сердцу мечты.*
*Пусть природа вас любит,*
*И ранней весной*
*Пусть чарует и манит*
*Своей красотой.*

*Пусть срываются звезды*
*С небес в вашу честь,*
*Пусть сбываются грезы*
*Так часто – не счесть!*

*Я люблю вас*
*И все отпускаю грехи,*
*Даже если когда-то*
*Вы были плохи,*
*Даже если обидели*
*Больно меня,*
*Я прощаю вас всех*
*И, конечно, себя.*

Наталья КУЗЬМЕНКОВА,
студентка гр. Б-31.



## АНГЕЛ ИЛИ ДЕМОН

*Может быть сегодня,*
*Может быть вчера.*
*Может ты уходишь,*
*Может ты пришла.*
*Может это было,*
*Может это есть.*
*Может ты любила,*
*Может это месть.*
*Я не знаю точно,*
*Где же и когда*
*Мы с тобою скрестим*
*Два наших крыла.*
*Ангел с поднебесья*
*Будет не за нас,*
*Демоны из ада –*
*Вот, пришел их час!*
*Кроткость и беспечность*
*Не помогут здесь,*
*Нам покажут вечность*
*И отвергнут лесть.*
*Здесь угрюмо, тихо,*
*Черные кресты.*
*Там противно, сухо,*
*Подлость и лжецы.*
*Здесь покажут правду*
*Черную, как ночь.*
*Там "святая правда"*
*Превратится в дождь.*
*Красный дождь кровавый,*
*Совесть там молчит,*
*Памяти провалы –*
*Из забвенья щит.*
*Ангел или демон,*
*Ад, а может рай,*
*Черный или белый.*
*Вот и выбирай.*

Александра КРУПОДЕРОВА,
студентка гр. Р-21.

## СЕРАЯ КОЛОННА

**Солдат не умирает,**
**Когда его убивают.**
**Солдат умирает,**
**Когда его забывают.**

*Уходят наши мальчишки,*
*Забросив стихи и книжки.*
*Уходят в горячие точки*
*По-взрослому строго и срочно.*

*Глаза и сердца серьезны:*
*"Мама! Мама ... прости,*
*Наверное, невозможно*
*Найти другого пути".*

*Уходят серой колонной,*
*В шинелях не по размеру.*
*Разве можно измерить*
*Горе матери мерой?*

*Совсем недавно – мальчишка,*
*В соседку по парте влюбленный,*
*Сегодня уходит строго*
*Один из серой колонны.*

*Они и пожить не успели,*
*Весной не дышали вволю.*
*Теперь им снятся капели,*
*Речка, ржаное поле...*

*Ну что ж, идите, мальчишки!*
*Вам жизнь защищать придется.*
*Но что б ни случилось, знайте –*
*Мы вас даже мертвых ...*
*дождемся!..*

Анастасия ЛУКЬЯНОВА,
студентка 4-го курса
юридического факультета.

## ТЫ

Ты — воплощение судьбы
На этом черно-белом свете,
Твой взгляд, исполненный любви,
Звездой с небес мне в душу
светит.

Упали капли на порог
Из черных недр небесных трещин,
Ты воплощение дорог,
Где Иисус ходил воскресший.

Весь мир под линзою слезы
Из рук твоих принял крещенье,
Ты — воплощение грозы,
Что всем приносит очищенье.

Душа твоя, как свет, чиста,
Ее не омрачит ненастье,
Ты — воплощение креста,
Где быть распятым — это счастье...

* * *

Шакалы-сумерки спустились,
Прошлись, разбрасывая тени,
С почтеньем должным расступились
Пред Ночью, преклонив колени.
А Ночь крылом взмахнула синим,
Блеснули краски звездной шали,
Своей негаснущею силой
Уснувший мир околдовали.
Живой фонарь, как сторож старый,
Согнувшись от ночной прохлады,
Бросает желтый свет устало
На тени дремлющего сада.

Вуаль прозрачного безмолвья
Чуть-чуть дрожит от этой ласки,
Луна лежит у изголовья
Царицы-Ночи, шепчет сказки.
И холодок росы туманной
Вдохнешь всей грудью ночью
лунной —
Как вихрь весенний, ветер пьяный
Ворвется с радостью безумной.

* * *

Твой взгляд ни ласковый,
ни нежный,
Твой взгляд — с язвительной
насмешкой,

С чего бы это вдруг.
Хоть мы с тобой давно знакомы,
Душа твоя мне не ведома,
Так кто ты? Просто друг.

Да, просто друг, чего же боле
Ждать от шального ветра в поле,
Ему ведь все равно.
Ему плевать на то, что холод
Забрался в душу, сердце колет.
Бесчувственный. Давно?

Какой уж век ты оборванцем
Кружишься в сумасшедшем танце,
Ни зверь, ни человек?
Куда душа твоя из тела, тебя,
покинув, улетела,
И правда ль, что навек?

Не верь тем людям, что пророчат
Тебе погибель в темной ночи,
Нет правды в их словах.
Душа вернется и воскреснет,
Забьется жизнь в уставшем
сердце.

Ты верь, и будет так.

Марына СЯРГЕЕНКА,
студэнтка гр. Р-31.

## У РОЗДУМЕ



— Ружа, ты такая прыгожая. А навошта ж табе шыпы? Яны ж толькі псуюць тваё хараство.

— Гэта, каб абараняцца ад такіх жа нядобрых, як ты, брыдкі злачынца, хто хоча зламаць мяне!

***

У аднаго з індэйскіх плямёнаў Новага Свету існавала паданне: калі памірае чалавек, ягоная душа адлятае на неба і робіцца зоркай. І чым чысцей і сумленней ён быў, чым прамейшым быў ягоны шлях у жыцці, тым ярчэйшым будзе ззянне ягонае зоркі.

А чаму ж цяпер нябёсы такія цёмныя? Хіба прапала сумленне ў людзей? Ці душы нашыя пачарнелі ад жорсткасці?

***

Нездарма кажуць людзі: першае каханне самае моцнае, але мала хто бывае ад яго шчаслівы.

Яны сустрэліся і не маглі адно без аднаго нават дыхаць. Расстаючыся ўвечары, ім здавалася — да раніцы цэлае стагоддзе. Колькі год правялі яны побач. Але казка не бывае векавечнай. І чорным ценем пралягла паміж імі Крыўда.

Хто быў болей вінаваты, хто меней — ці ў гэтым справа? Іх шляхі разышліся: яна аддала сябе за нялюбага, а ён... Ён увогуле зненавідзеў жанчын.

Але ці можна задушыць Каханне? Голас яго праляціць праз усе далечы і стагоддзі, ні адзін віхор не прымусіць яго прыпыніцца, бо Каханне не можа загінуць — яно бессмяротнае.

Усё часцей узгадвае яна ягоны твар, рукі, ласкавыя словы. І ад такіх успамінаў пачынала балюча шчымець недзе глыбока ў грудзях, там, дзе даўно пахавана яе па-чуццё.

Але не толькі да яе прыходзіў боль. Ён развучыўся спаць па начах, бо сніў яе, баяўся думаць, бо думкі былі аб ёй, у кожнай сустрэчнай бачыў ён яе вочы.

Яна развялася з мужам, бо ёй рабілася брыдка, калі той дакранаўся да яе: гэта ж былі НЕ ЯГОНЫЯ рукі.

Кожны вечар хадзіла яна да ракі, на тое самае, на ІХНЯЕ месца, гадзінамі сядзела на ўзгорку, а ўспаміны завіхаліся вакол яе.

Скончылася зіма, вясна праляцела, прыбегла лета. У гэты вечар ёй было асабліва сумна; слязінкі маленькімі кропелькамі каціліся па шчаках. І раптам нехта падыйшоў, ціха абняў за плечы, прытуліў да сябе. Над самым вухам пачула яна знаёмы голас. Ён шаптаў, што цяпер аніякая крыўда не здолее разлучыць іх, бо цяпер яны моцныя — яны назаўсёды побач...

Старыя людзі кажуць: не бывае ніхто шчаслівы ад першага кахання. А можа, памыляюцца, і бывае?

Петр КУЗНЕЦОВ,
студент гр. Г-21,
исторического факультета.



## ПОДГОТОВКА К ЭКЗАМЕНУ ПО "ИСТОРИИ СРЕДНИХ ВЕКОВ"

*С пожелтевших страниц,*
*Как из толщи веков,*
*Мы за день узнаем то, что длилось сто лет.*
*Будто нету границ,*
*Не бывало оков,*
*Да и прожитых этих столетий уж нет!*

*Из учебника смотрят на нас, не мигая,*
*(Мы запутались, что же здесь ложь,*
*а что – правда)*
*Реформаторы и лютеране из рая,*
*Инквизиторы и крестоносцы из ада.*

*И мы слепнем и глохнем от горя и слез,*
*Тех, что лили крестьяне под тягостным*
*гнетом.*
*От безумных надежд и несбыточных грез,*
*Что дарили патриции диким вестготам.*

*А в учебнике вновь*
*Продолжается бой*
*Феодалов и папы за земли и власть.*
*Барбаросса льет кровь,*
*Обозленный судьбой,*
*Королевство остготов обязано пасть...*

Татьяна СТРУГ,
студентка гр. ПМ-25
математического факультета.

## SOS

*Мы все порою обещаем,*
*Того, что выполнить невмочь*
*И тяжко всех обременяем,*
*Уже не в силах им помочь.*
*Вот я попалась в эти сети*
*Крутых нитей и бурных слов*
*И все пыталась вырваться,*
*как дети,*
*Которые боятся страшных снов.*
*И снова задаю себе вопрос:*
*Зачем же столько лжи на свете?*
*Но все кричат лишь слово "SOS",*
*Ну кто-нибудь, ответьте...*
*Ответа нет, его не существует,*
*Ведь Бог изгнал людей из рая из-за лжи,*
*И Дьявол говорил, что зло*
*восторжествует,*
*Ведь кто не врал? Его мне покажи!?*
*Давайте, просто выполнять,*
*Не ложью покрывая, обещанья,*
*Все явно говорить, а не скрывать,*
*Тогда наступит мир и пониманье.*

**Наш боль – Чарнобыль**

# ЯБЛЫКІ З РОДНАГА САДУ



Кажуць, што час — лепшы лекар. Ён гоіць людзям душэўныя раны, прытупляючы боль ад страт: родных, блізкіх, сяброў, наогул усяго, чым мы вельмі даражым.

Прайшло 15 гадоў, як страшнай весткай уварваўся ў жыццё людзей разбураны ядзерны монстр. Чарнобыльская катастрофа, зрываючы з родный мясцін тых, хто апынуўся на пасыпаных радыеактыўным попелам тэрыторыях, бы віхура, раскідала іх паўсюдна. Як вырванае з каранямі дрэва цяжка прыжываецца на іншай зямлі, так і вымушаныя перасяленцы хварэюць, з вялікай тугой абжываюцца на новым месцы. І час, няўмольны ў сваім няспынным бегу, так і не змог стаць гаючым для іх збалелых душ.

Радыяцыйная навала закранула ўсіх нас, жыхароў Гомельшчыны, бо менавіта яна пацярпела больш за ўсе астатнія 16 абласцей Расіі, Украіны і Беларусі, якія пасыпаны цэзіем і стронцыем. Многія з нас страцілі сваю маленькую радзіму — гарадскі пасёлак ці вёсачку, якія ўвайшлі ў небяспечную для пражывання зону. Выпіць гэту горкую чашу давялося і мне асабіста. Нельга больш паехаць з сынам у час летняга водпуску ў Брагін, да старэнькай маці. І яна стала той перасяленкай, якая літаральна штодня восень ужо на працягу амаль дзесяці гадоў, што жыве разам са мной, са слязамі ўспамінае нашу пакінутую, асірацелую хату, сядзібу, у свой час з вялікай любоўю дагледжаную, з кожным выпеставаным ягадным кусцікам, пладовым дрэвам і вінаграднікам.

Штогод з надыходам вясны новай шчымлівай хваляй агортваюць мяне ўспаміны пра родны дом і жаданне з'ездзіць туды, паглядзець на яго становішча непераадольна моцным. Не вытрымала ўсё ж душа, і мінулагоднім сонечным жнівенем я адчыніла такія родныя веснічкі, увайшла ў двор... Ад убачанага перахапіла дыханне, застраў камяк у горле і набеглі на вочы слёзы. З цяжкасцю прадзіраючыся праз бур'ян вышынёй у мой рост, дабралася да нашага саду. Крамяныя жоўтыя і чырвоныя яблыкі, ад якіх ледзь не ламаліся галіны, здавалася, так і прасілі: "Вазьмі, пакаштуй нас як некалі раней, да радыяцыі. Ты ж так нас любіла..."

Не вытрымала. Сарвала ў цэлафанавы пакет дзесяткі з два і павезла з сабой, у Гомель. Сакавітыя, пахучыя, яны доўга ляжалі ў мяне на балконным падаконніку. Як балючы напамін і нямы дакор...

**Т.ДУБЯК.**

**Водгук дзіцячага сэрца**

# ДЗЯКУЙ ТАБЕ, ДАРАГАЯ МАТУЛЯ!

**Голас незнаёмага можа здзівіць,**
**Голас сябра — на хвіліну спыніць,**
**Голас любай — сагрэць сонцам лета,**
**Голас маці — вярнуць з таго свету.**

**М.Танк.**

Я не выпадкова ўспомніла гэтыя цудоўныя радкі Максіма Танка. На яго думку, голас маці можа не толькі прымусіць жыць і змагацца, але нават "вярнуць з таго свету".

Я згодна з гэтым, але ўсё ж, на маю думку, маці не проста можа "вярнуць з таго свету" — яна можа зрабіць нешта больш значнае, больш цудоўнае і больш немагчымае.

Маці — найдаражэйшы на свеце чалавек. Ніхто не можа так горка і так ціха тужыць, як маці. Ніхто не ўмее так цярпець і ахвяраваць сабой. І адразу ўспамінаецца старадаўняя прытча пра юнака, які ў ахвяру няўмольнай і хціваі каханцы прынёс матчына сэрца. Ён бег з ім у руках, спатыкнуўся аб камень і застагнаў: "Ой, табе ж баліць, сынок! Ідзі цішэй, дзіцятка", — прашаптала чулае матчына сэрца. Кожная сынава драпіна адгукалася ў матчыным сэрцы нясцерпным болем. Гора і няўдачы дзіцяці станавіліся яе горам і пакутамі. Доказам гэтага гучаць словы Аркадзя Куляшова: "Я хаце абавязаны прапіскаю, калыскаю, падвешанай пад столь. Я маці абавязан кожнай рыскаю, усім, чым хаце абавязан стол. Я — матчын спеў, я — матчыны трывогі".

Вось і атрымліваецца, што, па-першае, трэба сказаць: "Дзякуй табе, дарагая матуля! Дзякуй за матчыны трывогі, за тваё чулае сэрца, якое не ведае жыццёвых перашкод". Па-другое, я хачу сказаць: "Дзякуй табе, дарагая матуля! Дзякуй за тваю любоў, за тваё шчырае слова". У дзяцінстве шчырае слова — гэта матчына песня, матчына казка, матчына калыханка. У юнацтве — гэта добрая парада, гэта клопат маці аб маім жыцці. У маім будучым самастойным жыцці — гэта матчына благаславенне, матчына дапамога словам, справай і грашыма. І, нарэшце, апошнія шчырыя словы матулі аб шчасці, аб тым, каб помніў. Адным словам: "Дзякуй табе, дарагая матуля! За тое, што ты ёсць, за тое, што ты любіш мяне".

Я па-свойму люблю і шкадую сваю матулю. Хачу, каб яна заўсёды была здаровая.

Беражы цябе, Божа, мая мілая мамачка, і я ж буду берагчы так, як змагу.

Прымі ж словы ўдзячнасці, родная матуля!

**Кацярына ЛАПУНОВА,**
**вучаніца 11 класа абласнога ліцэя.**



# ЛАБИРИНТЫ СКАЗОЧНОЙ СТРАНЫ

**В лаборатории прикладной психологии университета состоялся семинар-тренинг по сказкотерапии. Его проводила член Российской арт-терапевтической Ассоциации, арт-терапевт Наталья Александровна Сакович.**

Сказкотерапия как метод была официально зарегистрирована в 1997г., хотя имеет гораздо более длительную историю, по большому счету, равную истории существования самой сказки. Пожалуй, нет такого психологического метода, который обошелся бы без использования сказок, историй, метафор. Поэтому сказкотерапия синтезирует в себе различные психологические, психотерапевтические, педагогические направления, облекая их в сказочную, метафорическую форму. Другими словами, сказкотерапия — это процесс терапевтического, коррекционного, развивающего воздействия сказочной средой.

И хотя этот метод уже показал свою эффективность в работе с людьми разного возраста, в практике психологов нашего города он используется не очень широко, в первую очередь по причине недостатка информации о нем. Поэтому данный семинар был очень ценным для психологов, заинтересованных в повышении эффективности своей работы.

Профессионализм ведущей обеспечил максимальную вовлеченность всех участников семинара в процесс овладения основами использования сказок в работе психолога. Начинающие специалисты смогли получить целостное представление о возможностях сказки как средства позитивного воздействия. Более опытные психологи смогли значительно расширить представления о своих профессиональных возможностях, т.к. получили множество конкретных практических рекомендаций, которые для энтузиаста в своем деле могут послужить прямым руководством к действию.

Кроме того, большинство участников семинара вышло из стен лаборатории убежденными сторонниками этого метода, по той причине, что они почувствовали необычное воздействие сказки на самих себя. Сказочная обстановка позволила вновь обрести ту непосредственность, открытость, которая присуща детям, и от недостатка которой так страдают взрослые. Участники семинара познакомились с приемами использования рифмотворчества и игровых элементов в сказкотерапии, а также получили возможность ощутить на себе воздействие рисования объемными красками — одного из арт-терапевтических приемов. На семинаре был осуществлен обзор мифов и их использования в работе с подростками и взрослыми. Кульминацией семинара-тренинга стало знакомство с куклотерапией. Участники не только получили теоретические сведения о возможностях использования кукол в психологической практике, но и сами изготовили марионетки, ощутив на себе волнующий творческий процесс.

Семинар закончился импровизированной сказочной постановкой с использованием только что созданных кукол.

**Галина БУСУРИНА,**
**слушатель курсов ИПК и ПК по специальности "Практическая психология".**

# ПАЛАЖЭННЕ АБ АКАЗАННІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ АСПІРАНТАМ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

Аказанне матэрыяльнай дапамогі праводзіцца за кошт і ў межах бюджэтных сродкаў, якія выдзяляюцца на стыпендыяльнае забеспячэнне.

Сума адлічэнняў на матэрыяльную дапамогу вызначаецца ў памеры 1,5% планавага стыпендыяльнага фонду аспірантаў.

Сродкі на аказанне матэрыяльнай дапамогі могуць быць зрасходаваны на наступныя мэты:

а) набыццё медыкаментаў і аказанне грашовай дапамогі ў перыяд працяглай хваробы або праходжання курсу лячэння ў стацыянары (пры наяўнасці бальнічнага ліста) аспірантам у памеры **3 мінімальных зарплат;**

б) аказанне матэрыяльнай дапамогі маладым сем'ям:

— у сувязі з нараджэннем дзіцяці ў памеры **10 мінімальных зарплат;**

— маючым адно дзіця ў памеры да **2 мінімальных заработных плат** не больш аднаго разу ў год;

— маючым двух і больш дзяцей у памеры да **4 мінімальных заработных плат** не больш аднаго разу ў год.

Аказанне дапамогі на пахаванне пры смерці бацькоў або дзіцяці — у памеры **10 мінімальных зарплат.**

Аказанне дапамогі ў сувязі з аварыяй, стыхійным бедствам, пажарам і іншымі надзвычайнымі абставінамі ў памеры да **10 мінімальных зарплат.**

У межах выдзеленых сродкаў можа быць аказана матэрыяльная дапамога ўсім аспірантам універсітэта ў памеры да **1 мінімальнай зарплаты:**

— у сувязі з ростам цэн і інфляцыяй з улікам адставання сярэдняй заработнай платы ў дзяржбюджэтнай сферы ў параўнанні з сярэдняй зарплатай рабочых і служачых па рэспубліцы (на падставе дадзеных статыстыкі);

— для аздараўлення і вывазу дзяцей з радыеактыўнай зоны.

**Палажэнне разгледжана і адобрана Саветам універсітэта.**

# НАШЫ АСІЛКІ – НА "ВЫШЫНІ"!



У Полацку прайшоў чэмпіянат Беларусі па пауэрліфтынгу, у якім прынялі ўдзел і нашы студэнты.

Майстар спорту міжнароднага класа Уладзімір Гадуноў (V курс факультэта фізічнай культуры) перамог у трохбор'і, а ў жыме штангі лежачы ўстанавіў рэкорд рэспублікі — 190,5 кг у вагавай катэгорыі да 75 кг.

Трэцякурснік факультэта фізічнай культуры Пётр Клімкоў (125 кг) быў трэцім, упершыню выканаўшы нарматыў "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь". Акрамя гэтага Пётр устанавіў рэкорд Беларусі ў трохбор'і сярод юніёраў.

Як і ў мінулым годзе, нашых асілкаў трэніруе чэмпіён Еўропы сярод ветэранаў, майстар спорту Уладзімір Галавач. Да гэтага трэба дадаць, што гэта ўжо 14-ы майстар спорту, які быў падрыхтаваны ва універсітэцкай трэнажорнай зале.

Мала хто ведае, што ініцыятарам будаўніцтва і абсталявання трэнажорнай залы — пры падтрымцы рэктарата — быў загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту нашага універсітэта заслужаны трэнер Беларусі, дацэнт В.А.Каляда. Таму да поспехаў нашых асілкаў Віктар Антонавіч мае непасрэднае дачыненне.

**В.МАРЧАНКА.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— тэорыі і гісторыі дзяржавы і права — асістэнта;
— заалогіі і аховы прыроды — асістэнта;
— фізвыхавання і спорту — выкладчыка;
— тэорыі і практыкі англійскай мовы — выкладчыка;
— аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры — выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, АГЧ, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў бухгалтэрыі выказваюць глыбокае спачуванне намесніку галоўнага бухгалтара **Азаўчыкавай Ганне Уладзіміраўне** з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БАЦЬКІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў вучэбнага аддзела выказваюць глыбокае спачуванне метадысту **Жэмчугавай Валянціне Пятроўне** — з выпадку напаткаўшага яе гора — заўчаснай смерці **МУЖА.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымліваліся даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 283
Падпісана да друку 21.04.2001 г.